ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, КАМСАМОЛЬСКАГА І ПРАФСАЮЗНЫХ КАМІТЭТАЎ БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

1988
ЧАЦВЕР
17
ЛІСТАПАДА
№ 30(1588)

Беларускі ўніверсітэт

## ТЭЛЕТАЙП

*УЧОРА • СЁННЯ • ЗАЎТРА*

### НАВУКОВЫЯ ДАСЛЕДАВАННІ

БДУ імя У. І. Леніна і сацыяльна-эканамічнае развіццё рэспублікі. Якая сувязь паміж гэтымі паняццямі і як яны ўплываюць адно на другое? Як зрабіць так, каб навуковыя распрацоўкі адпавядалі патрабаванням часу і прыносілі рэальную карысць? На гэтыя і многія іншыя пытанні пастараўся даць адказ у сваім дакладзе, з якім ён выступіў на пасяджэнні вучонага савета, прарэктар па навуковай рабоце, прафесар С. С. Шушкевіч.

Адказны сакратар прыёмнай камісіі, дацэнт Э. М. Шпілеўскі пазнаёміў прысутных з вынікамі прыёму студэнтаў у 1988 годзе і акрэсліў задачы універсітэта па прыёму 1989 года.

З. МІХНЕВІЧ.

### 70-ГОДДЗЮ ВЛКСМ

была прысвечана навукова-практычная канферэнцыя «Сродкі масавай камунікацыі і маладзёжны рух замежных краін», якая прайшла на аддзяленні міжнароднай журналістыкі. З дакладамі і паведамленнямі выступілі студэнты з розных краін свету. Цікавымі былі выступленні аспіранта Нгуен Туан Ронга «Праблемы моладзі ў публіцыстыцы Хо Шы Міна», студэнтаў Каіда Юсефа «Йеменскі Сацыялістычны Саюз Моладзі — актыўны ўдзельнік рэвалюцыйных пераўтварэнняў», А. Баханко «Палітычная актыўнасць моладзі Польшчы на розных этапах будаўніцтва сацыялізму», Мубдада Імад Шайя «Моладзь Лівана ў барацьбе за свабоду сваёй радзімы» і іншых.

РАШЭД АХМЕД,
студэнт аддзялення міжнароднай журналістыкі.

### НОВЫЯ ВУЧЭБНЫЯ

кінафільмы паступілі ў фільматэку БДУ. Сярод іх «Лазерныя медыцынскія ўстаноўкі», «Робатызаваная вытворчасць», «Метады выдзяленняў ДНК бактэрый», «Рух крыві па сасудах», «Тэмпература цела», «Пачатак тэорыі алгарытмаў», «Дзейнасць партыі бальшавікоў 1914—1917 гг.», «XXVII з'езд КПСС» і іншыя. Калі вы вырашыце выкарыстаць іх у сваёй рабоце, супрацоўнікі сектара вучэбнага кіно дапамогуць вам у выбары неабходнага дапаможнага матэрыялу.

В. ШУШКЕВІЧ,
загадчык сектара вучэбнага кіно.

НА НАВУКОВАЙ ХВАЛІ

## Пра перамогу і... персанальныя камп'ютэры

НЕ ТАК ДАЎНО ў Сафіі праводзілася Міжнародная алімпіяда па матэматыцы і інфарматыцы, прысвечаная 100-годдзю Сафійскага універсітэта.

У спаборніцтвах па інфарматыцы прымалі ўдзел 15 універсітэцкіх каманд з НРБ, СССР, ВНР, ГДР, ПНР, ЧССР, СФРЮ. Савецкі Саюз прадстаўлялі каманды Маскоўскага, Ленінградскага, Латвійскага і Беларускага універсітэтаў.

У каманду БДУ уваходзілі студэнты ФПМ Д. Дварцавы, А. Хадарына (IV курс), І. Волкаў (V курс) і А. Карзюк (II курс). Кіраўнік — дацэнт кафедры матэматычнага забеспячэння САПР У. М. Котаў.

— Задачы і тэсты, прапанаваныя на алімпіядзе, выклікалі вялікую цікавасць удзельнікаў,— гаворыць Уладзімір Міхайлавіч.— Студэнты абменьваліся інфармацыяй па мовах праграміравання і асаблівасцях персанальных камп'ютэраў розных відаў. У іх была магчамасць параўнаць узровень сваёй падрыхтоўкі, выявіць яе моцныя і слабыя бакі. І самае галоўнае: пабываўшы там, мы пераканаліся, што наша матэрыяльная база не вытрымлівае ніякіх параўнанняў. Супастаўце такія лічбы: у нас на факультэце толькі тры сучасныя персанальныя камп'ютэры, а ў адным класе Сафійскага універсітэта — сорак. І ўсё ж у час работы з імі нашы студэнты былі лепшымі. Яны хутка навучыліся працаваць на персанальных камп'ютэрах «Правец-16», з якімі раней не сутыкаліся, прадэманстравалі добрыя тэарэтычныя і практычныя веды ў галіне інфарматыкі. У выніку — наша другое агульнакаманднае месца (першае — у Ленінградскага універсітэта), а студэнты Д. Дварцавы і І. Волкаў занялі адпаведна першае і чацвёртае месцы ў асабістым заліку.

Перамога каманды БДУ не была выпадковай. Удзельнікі яе два разы за апошнія тры гады перамагалі на Усесаюзнай алімпіядзе па ЭВМ і праграміраванню. Пераможца Усесаюзнай алімпіяды 1987 года Д. Дварцавы ўзнагароджаны дыпломам і медалём Дзяржкамітэта СССР па народнай адукацыі, а ЦК ВЛКСМ прэміраваў яго турыстычнай пуцёўкай па лініі «Спадарожніка» у адну з сацыялістычных краін.

Нязменны кіраўнік каманды — У. М. Котаў. На кафедры пад яго кіраўніцтвам для студэнтаў і школьнікаў працуе гуртак «Алгарытміка» і СНДЛ «САПР на персанальных ЭВМ», праз якія ажыццяўляецца падрыхтоўка каманды да спаборніцтваў.

І яшчэ. Журы алімпіяды звярнулася з прапановай да кіраўніцтва універсітэтаў зрабіць яе традыцыйнай і праводзіць кожны год у розных універсітэтах.

І. СОЎПЕЛЬ,
старшыня Савета НТТМ ФПМ, дацэнт.

Галоўнай у размове за «круглым сталом» «Беларускага універсітэта» была ўсё ж спрэчка. Таму, магчыма, не абмежаваліся яе ўдзельнікі прапанаванай тэмай: «Нефармалы»: супрацоўнічаць ці абвяргаць?» Паспрабавалі знайсці адказы на розныя пытанні, узняць многія праблемы. Няхай няроўна і часам залішне канкрэтызавана вялася гутарка, у якой асноўнымі дзеючымі асобамі былі: Я. В. ПЕТУШКОВА — прафесар кафедры марксісцка-ленінскай філасофіі гуманітарных факультэтаў; А. А. ГРЫЦАНАЎ — в. а. дацэнта кафедры марксісцка-ленінскай філасофіі прыродазнаўчых факультэтаў; В. А. КЛЯЦКОЎ — выкладчык кафедры палітэканоміі прыродазнаўчых факультэтаў; М. Ф. ПІЛІПЕНКА — дацэнт кафедры археалогіі, этнаграфіі і дапаможных гістарычных дысцыплін; С. ВІТУШКА — студэнт III курса гістфака, старшыня клуба «Талака»; С. АДАМОВІЧ і М. СКОБЛА — студэнты філфака, прадстаўнікі аб'яднання «Тутэйшыя». Яна дала свае вынікі.

Справаздачу аб «круглым стале» мы змесцім у наступным нумары газеты.

НАТАТКІ З ПРЫХІЛЬНАСЦЮ



## Энтузіязм... па загаду?

Да нядаўняга часу мы былі перакананы, што камсамольскі запал не згас і сёння. Ды і прыклады таму ёсць. Камсамольская арганізацыя універсітэта прысвяціла 70-годдзю ВЛКСМ шмат мерапрыемстваў (пра некаторыя з іх мы расказалі на старонках газеты). Сярод іх значылася і правядзенне суботнікаў. Вось тут і настаў час сказаць аб той лыжцы дзёгцю, якая псуе бочку мёду.

З самымі добрымі намерамі накіраваліся мы з фотакарэспандэнтам С. Грыцам на стадыён, дзе ідзе будаўніцтва спартыўнага комплексу БДУ. Тут на суботніку павінны былі працаваць студэнты механіка-матэматычнага факультэта. Іх мы і хацелі сфатаграфаваць, расказаць, як яны працуюць. На жаль, фотарэпартаж не атрымаўся. Прычына самая празаічная: не знайшлі «герояў нашага часу». Не магу сцвярджаць, што яны тут зусім не паяўляліся, бо ў камітэце камсамола універсітэта мяне запэўнілі, што мехмат разы два на будоўлю прыходзіў, толькі працаваць не давялося: першы раз нікога з «мясцовага» кіраўніцтва не знайшлі, другі — не былі забяспечаны фронтам работ (наконт іншых факультэтаў высветліць нічога не ўдалося).



Дарэчы, тут жа, у камітэце камсамола, мне паказалі загад, падпісаны рэктарам: «Дэканам факультэтаў, сакратарам камітэтаў камсамола. У сувязі са складаным становішчам з будаўніцтвам спартыўнага комплексу БДУ, рэктарат, камітэт камсамола універсітэта просяць вас арганізаваць работу студэнтаў па наступнаму графіку». І далей распісана, хто і калі павінен працаваць на будоўлі.

Чаму з'явілася такая папера, здагадацца не цяжка: тэрміны здачы комплексу падганяюць, а недаробак шмат. Вядома, дапамагчы трэба. Спачатку разлічвалі на камсамольскі энтузіязм. Агітавалі, заклікалі. Толькі мала хто да гэтага прыслухоўваўся. Аргументы простыя: няхай будаўнікі выпраўляюць свае памылкі самі. А што грошы ўсе выбралі і няма чым плаціць рабочым, дык гэта іх уласнае гора. Давялося пачуць і такое выказванне: «Мы павінны працаваць задарма? З якой нагоды? Вось каб ведалі, што грошы, зробленыя на суботніку, пойдуць на нашы патрэбы, тады іншая справа».

З гэтымі меркаваннямі (улічваючы вялікую загружанасць студэнтаў) можна было б пагадзіцца. Толькі хацелася б удакладніць адно пытанне: а спартыўны комплекс БДУ — гэта чыя патрэба? І, здаецца, кожны павінен быць зацікаўлены ў тым, каб ён пачаў дзейнічаць як мага хутчэй.

Але вернемся да загаду. Выдаць то яго выдалі, а вось пракантраляваць, як ён выконваецца...

Апошні пункт вышэйназванага дакумента абвяшчаў: «Даныя аб праходжанні суботніка падаваць у рэктарат памочніку рэктара С. І. Сяргееву». Да яго я і накіравалася ў пошуках дакладнай інфармацыі. Але Сяргей Іванавіч спачувальна развёў рукамі: «Рады быў бы вам дапамагчы. Але як? Ніякіх звестак з факультэтаў мне не прыносілі». Прыкладна тое ж пачула і ў камітэце камсамола, і ў парткоме.

Паўстае і другое пытанне: ці патрэбны наогул студэнты на аб'екце? Адмовіліся ж будаўнікі ад прапанаванага будатрада летам. Маўляў, у іх засталіся толькі аддзелачныя і сантэхнічныя работы, а выканаць іх могуць спецыялісты. Адкуль жа сёння ўзнікла такая пільная патрэба?

І яшчэ адно назіранне просіцца на паперу. Калі б з боку універсітэта і кіраўнікоў будаўніцтва было ўсё як след прадумана, то не давялося б студэнтам губляць штодня свой час на блуканне па будпляцоўцы ў пошуках прараба ці майстра.

З. АЛЯШКЕВІЧ.



Перад вамі — не шчаслівчык, якому пашанцавала ў грашовай латэрэі, або выпалі трапныя нумары ў спортлато. Але тым не менш, кожны месяц Юрый Сцепанчук становіцца ўладальнікам некалькіх тысяч рублёў. Праўда, «траціць» ён іх вельмі хутка і праз дзень-другі амаль нічога не мае. Адкуль, скажаце вы, узяўся такі транжыр? Справа ў тым, што Юрый — адзін з тых 55 старастаў філфака, якія атрымліваюць стыпендыі для груп. Вось ужо чатыры гады ён выконвае гэты абавязак. І нездарма дзяўчаты завуць яго «родным бацькам». Юра сапраўды аказаўся такім, бо лічыць, што староста павінен ведаць сваю групу лепш за ўсіх. Дзелячы напалам і радасці, і нягоды.

Справы, справы... Яны накатваюцца адна за другой, і не верыцца, што за ўсім гэтым Юрый паспявае быць яшчэ старшынёй вучэбна-вытворчага камбіната філалагічнага факультэта, добра вучыцца. Зусім нядаўна за выдатную вучобу і грамадскую работу ён атрымаў Ганаровую грамату Мінскага абкома камсамола.

А. МАКСІМАЎ.

**Так было не раз. Напружаная работа, якая была зроблена летам, нагадвала аб сабе нават у адпускны час: раз-пораз у свядомасці ўсплывалі тыя ці іншыя сітуацыі экзаменацыйных хваляванняў, зноў «прайграваліся» рабочыя моманты прыёмнай камісіі. Аднак некалькі інакш, чым раней, успрымаюцца членамі экзаменацыйнай камісіі па гісторыі СССР прайшоўшыя экзамены.**

# Гарачае лета-88
## або Роздум адпускніка



А ПЕРАД ёю ў гэтым годзе стаялі складаныя задачы, абумоўленыя тым, што экзамен па гісторыі СССР у школе адным росчыркам пяра быў адменены (што, дарэчы, вызначана як акт «грамадзянскай мужнасці»), было выпушчана з-пад увагі, што выпускнікі праз два-тры тыдні пасля школьнай гутаркі па айчыннай гісторыі апынуцца на экзамене па гэтай жа гісторыі, але ўжо пры паступленні ў ВНУ.

Увесь ход экзаменаў даказаў, што данае рашэнне не прадуманае. Зразумела, ва ўмовах запраграміраванага навучання, існавання жорсткіх рамак выкладання курс гісторыі СССР у дзевятых-дзесятых класах не мог быць зменены, дапоўнены новымі звесткамі, вывадамі, ацэнкамі. Цэнтралізаваную аднастайнасць у выкладанні і разуменні гісторыі ўвесці не пад сілу нават новаму ведамству. Тым больш у максімальна кароткі тэрмін — лічаныя месяцы, з максімальнай адназначнасцю ў трактоўцы складаных перыядаў і падзей гісторыі нашай краіны. А ці варта наогул на гэта арыентавацца? Ці патрэбны нам адзіны, стабільны, усёведаючы, які б раскрываў абсалютную ісціну, падручнік? Магчыма, сам час падказвае нам іншы шлях (і зусім не адзіны) спасціжэння гістарычных ведаў навучэнцамі і, у першую чаргу, старшакласнікамі. Гэта работа з дакументамі, аналіз розных пунктаў гледжання гісторыкаў (і не толькі гісторыкаў). Тут як ніколі раней неабходны НАСТАЎНІК. Патрэбна спецыялізацыя гуманітарыяў наогул, а гістарычная — у прыватнасці. Неабходна рашучая рэформа школы.

Рэформа не толькі заклікана сфарміраваць новага вучня, яна, у выніку, павінна нарадзіць абітурыента новага якаснага ўзроўню. Яна самым непасрэдным чынам павінна ўздзейнічаць на ступень падрыхтаванасці студэнта і выпускніка ВНУ, тым самым павінна закласці асновы падрыхтоўкі і выхавання НАСТАЎНІКА.

А праграма па гісторыі СССР для ўступных экзаменаў? У гэтым годзе яна была «спушчана» у самы апошні момант: ужо сабралася прыёмная камісія універсітэта на агульную нараду перад пачаткам экзаменаў, і тут выкладчыкі-гісторыкі атрымалі па аднаму экземпляру. А як быць абітурыенту? Ён, разгублены ад усіх навацый, прыйшоў на экзамен і нават не здагадваўся, што новая праграма падрыхтавала яму шэраг сюрпрызаў. Праграма то патрабавала раскрыць «выдатную ролю І. В. Сталіна у пабудове сацыялізму, у разгроме фашызму», то настойліва рэкамендавала завастрыць увагу на рашэннях XX з'езда КПСС і раскрыць сутнасць «застойных гадоў», не забыўшы нацэліць абітурыента на самастойнасць і творчасць у расказе аб перабудове, дэмакратызацыі, галоснасці. Былі ўведзены ў яе і пытанні па навейшай гісторыі. Карацей, расказ аб «якасцях» праграмы — сюжэт даволі займальны. Не дзіўна, што некаторыя цэнтральныя і рэспубліканскія выданні, хоць і крышачку са спазненнем, выказалі некалькі «добрых слоў» наконт гэтай злашчаснай праграмы.

У цяжкім становішчы аказалася і прыёмная камісія — праграма для яе закон, абыйсці які нават у наш час нельга. Але члены камісіі пакінулі за сабой права весці экзамен так, як ім падказваў іх прафесіяналізм, грамадзянская пазіцыя. На гістфаку ў яе састаў увайшлі вопытныя педагогі, за плячыма якіх — не адна сотня праведзеных экзаменаў: дацэнты М. П. Баранава, М. Г. Елісееў, І. В. Каменская, К. А. Равяка, В. Г. Рудкін, В. Н. Сідарцоў і іншыя.

Патрэбна сказаць, што многія асцярогі прыёмнай камісіі не апраўдаліся. Яны былі звязаны са складанасцямі ў трактоўцы некаторых перыядаў паслякастрычніцкай гісторыі краіны. З разліку на мяркуемую грунтоўнасць адказаў былі выпрацаваны крытэрыі іх ацэнкі. Зыходзілі з таго, што абітурыент павінен добра валодаць фактычнай інфармацыяй, ведаць вывады (на аснове падручніка), але ў той жа час у расказе павінен прысутнічаць аналіз тых пунктаў гледжання па пытаннях гісторыі, якія зараз выказваюцца навукай, публіцыстыкай, грамадскай думкай.

На жаль, даводзіцца прызнаць, што некаторыя абітурыенты слаба ўяўлялі сутнасць негатыўных з'яў у гісторыі СССР, не паказалі шырокага кругагляду, элементарнай начытанасці, умення аналізаваць вучэбны тэкст у сувязі з новымі фактамі і ацэнкамі. Словам, наўмысна ці з-за набытага ў школьныя гады ўзроўню ведаў асноўная частка паступаўшых не змагла адарвацца ад дагматычных, часам наіўных і прымітыўных уяўленняў аб гісторыі нашай краіны ў 1917—1988 гг.

Варта адзначыць і зніжэнне ўзроўню ведаў абітурыентаў. Вельмі павярхоўнымі былі яны па гісторыі народаў нашай краіны (у тым ліку і па гісторыі Беларусі), па гісторыі культуры. Як правіла, экзаменуемыя мелі слабыя ўяўленні аб важнейшых працэсах, з'явах, фактах: аб узнікненні класаў і дзяржаўнасці, аб прычынах феадальнай раздробленасці і прычынах утварэння цэнтралізаванай дзяржавы, аб адметных рысах палітычнага развіцця на тых ці іншых этапах, асаблівасцях расійскага імперыялізму... Як бачыце, аказалася, што выпускнік школы мае вельмі пасрэдныя веды нават па тых раздзелах гісторыі, якія не выклікаюць сумненняў: матэрыял падручнікаў за 7—8 класы засвоены ім неглыбока. Думаецца, што школьны экзамен па гісторыі павінен быць адноўлены, прычым у поўным аб'ёме, калі выпускнік, атрымліваючы атэстат, абавязаны валодаць ведамі не толькі па якіх-небудзь раздзелах, а ўсёй айчыннай гісторыі.

І ўжо зусім «каменем спатыкнення» з'яўлялася для многіх неабходнасць ведання фрагментаў з работ У. І. Леніна, дзе дадзена ацэнка расійскай гісторыі. У прыватнасці, многія нічога не маглі сказаць аб выказваннях Уладзіміра Ільіча наконт эвалюцыі дзяржаўнага ладу Расіі, аб новай эканамічнай палітыцы, аб задачах і шляхах будаўніцтва шматнацыянальнай сацыялістычнай дзяржавы і г. д.

...Экзамены адышлі ў гісторыю. Скрозь небывалы конкурс на гуманітарныя факультэты прайшлі (хочацца верыць) самыя дастойныя. Яны — першакурснікі нашага універсітэта. Прыёмная камісія спадзяецца, што яе работа рэалізуецца ў выдатнай вучобе будучых гісторыкаў, юрыстаў, філолагаў, журналістаў.

Гарачае лета 1988 года паставіла шэраг сур'ёзных пытанняў як перад гісторыкамі-экзаменатарамі, так і перад арганізатарамі народнай адукацыі. Паўтарэнне памылак гэтага года нельга дапусціць. Неабходны карэнныя змены. Першы крок, думаецца, патрэбна зрабіць на шляху прадастаўлення больш шырокіх правоў і паўнамоцтваў прадметным камісіям ВНУ.

А. ЯНОЎСКІ,
дацэнт кафедры гісторыі СССР дасавецкага перыяду, старшыня прадметнай камісіі па гісторыі СССР.



# РОБАТАТЭХНІЦЫ ПАТРЭБНЫ ЗАХОПЛЕНЫЯ

*—Колькі ні кажы дзіцяці: махні ручкай, стукні ножкай — ніколі не навучыш яго плаваць. Басейн, рака, мора і чалавек, які ўмее плаваць, побач,— такая тут методыка,— лічыць доктар эканамічных навук В. Тамашкевіч.*

*Гэты матэрыял пра чалавека, які вучыць плаваць.*

*— Студэнты паважаюць выкладчыка толькі ў тым выпадку, калі ён працуе сам,— перакананы чацвёртакурснік факультэта радыёфізікі і электронікі Дзіма Мілашэўскі,— і не некалі нешта зрабіў, а цяпер, сёння працуе — і з максімальнай аддачай.*

*Чалавека, які вучыць плаваць, студэнты паважаюць.*

— Веды, якія не замацаваны на практыцы, — згубленыя веды,— гаворыць асістэнт кафедры кібернетыкі факультэта радыёфізікі і электронікі Іван Аляксеевіч Шалатонін.

У лабараторыі «Радыёэлектронныя сродкі робатаў» замест ЭВМ і ўніверсальных вучэбных мікрапрацэсарных стэндаў не вельмі даўно былі толькі голыя сцены і сталы. Спачатку Шалатонін скончыў яшчэ адзін факультэт — павышэння кваліфікацыі — па спецыяльнасці прамысловыя робаты і робататэхнічныя сістэмы, пры Усесаюзным цэнтры робататэхнікі...

Праз чатыры гады існавання лабараторыі абсталяванне, закупленае і пераарыентаванае пад задачы кафедры ці сабранае «са свету па нітцы» і сшытае ўласнымі рукамі, дазваляе рыхтаваць спецыялістаў-робататэхнікаў па распрацаванай тут жа методыцы. У тры этапы: ад прасцейшых прыёмаў складання і адладкі праграм і мікрапраграм да распрацоўкі мікрапрацэсарных сістэм кіравання электрапрывадам, апрацоўкі сігналаў датчыкаў «ажыўлення» робатаў. Паколькі

— Усе ідэі павінны ўвасобіцца ў працуючыя ўстройствы, праграмы для ЭВМ — Шалатонін стварае спрыяльныя для гэтага ўмовы. Лабараторыя, як і ўся кафедра, вядзе «натуральную» гаспадарку. Гэта значыць, старанна назапашвае кожную дэталь. Купляе, дастае — каб кожная студэнцкая распрацоўка магла быць даведзена да канца. Бо

— Вучоба і навуковая работа студэнтаў не могуць існаваць асобна. Навука павінна рухаць вучобу.

Па стэнду, зробленаму ў мінулым годзе Дзімам Мілашэўскім (у Шалатоніна кожны стэнд носіць імя аўтара), сёння выконвае лабараторныя работы пяты курс. Навуковая работа аднаго ператвараецца ў вучэбны дапаможнік для іншых. А аўтару дапамагае здаць залік без дадатковай падрыхтоўкі. Ці з'ездзіць за мяжу. Так было з Дзімам Мельнікам, чыя работа на міжнародным студэнцкім конкурсе на лепшую навуковую работу па спецыяльнасці «электратэхніка і аўтаматызацыя» у Празе атрымала Ганаровую грамату.

Тое, што колькасць стэндаў з кожным годам павялічваецца, дазваляе студэнтам выбіраць тэму лабараторнай з некалькіх прапанаваных. Перспектыва перагрузіцца вучэбным матэрыялам лабараторыі не пагражае. Таму што робататэхніка на месцы не стаіць, а значыць:

— Кожны год прыкладна чвэрць лекцыйнага і лабараторнага матэрыялу абнаўляецца.

Дом будуецца на фундаменце. Чатырох- ці шасціпавярховым ён будзе — залежыць ад студэнта. Але не ніжэй вызначанага ўзроўню — таго самага чацвёртага паверху. Шалатонін лічыць сваім абавязкам даць няхай розныя па ступені складанасці, але аднолькавыя па трываласці веды і навыкі.

Лабараторныя стэнды таму і называюцца ўніверсальнымі, што дапускаюць адаптацыю на любы ўзровень ведаў. Тым, хто не можа выконваць складаныя заданні, прапануюцца больш лёгкія.

Прапушчаныя гадзіны Шалатонін адзначае. Не дзеля таго, каб на заліку сыпаць громы і маланкі на ўзмокшую галаву субяседніка. Ён папярэджвае адразу: на яго лекцыях—вольнае наведванне. Але па кожнай самастойна пройдзенай тэме будзе дадатковае пытанне. Кожнаму, хто самастойна мінуў тэму, будзе «незалік». За нежаданне працаваць.

На старэйшых курсах, калі студэнты ў стане працаваць без нагляду, яны атрымліваюць права на ключ ад лабараторыі і магчымасць працаваць у ёй у любы час.

— Амаль усіх, хто займаецца там, ад работы за вушы не адцягнеш,— дзеліцца назіраннямі чацвёрты курс.

А Шалатонін і не адцягвае. Таму што робататэхніцы патрэбны захопленыя і таму што

— Няма людзей, якія прыходзяць у ВНУ без жадання стаць добрымі спецыялістамі. Калі гэта жаданне з цягам часу знікае, вінаватыя мы.

І. ДЗЯРГАЧ.

## АБВЕРГНЕМ ЦІ АБМЯРКУЕМ?

# «Разбурайце» напаўсілы

*Эрыка — настаўніца адной з талінскіх школ і мая выпадковая субяседніца — прыводзіла важкія контраргументы. Мы спрачаліся пра міжнацыянальныя адносіны і ролю нацыянальнай культуры, недапушчальнасць нацыяналізму сярод моладзі і небяспеку замены інтэрнацыяналізму шавінізмам. Словам, пра ўсё. Прычым кожны з нас, адстойваючы свой пункт гледжання, гатовы быў выслухаць думку іншага.*

*І я каторы раз падумаў: знайсці агульную мову можна заўсёды, калі ёсць жаданне пазнаць народжаную ў спрэчках ісціну...*

Не вельмі даўно — у «застойныя» гады — мы гаварылі пра павышэнне ролі культуры ў пытаннях выхавання моладзі і пра ўдасканаленне міжнацыянальных адносін. Дэкларатыўныя разважанні стваралі ілюзію «шчырай заклапочанасці» аб нацыянальнай культуры. Заклікі «садзейнічаць», «нястомна сачыць», «актыўна развіваць» гублялі сэнс.

Перабудова паставіла сваёй задачай адраджэнне і папулярызацыю народных традыцый. У прэсе з'явіліся дыскусійныя матэрыялы, па радыё загучалі самыя розныя меркаванні. Узніклі самадзейныя нефармальныя суполкі, таварыствы, аб'яднанні.

Няцяжка зразумець тых (а такіх большасць), хто ўсур'ёз занепакоены: ці патрэбны нам гэтыя саюзы, ці не прынясуць яны непажаданых вынікаў? Пытанні сапраўды вельмі значныя — іх вырашэнне не дапускае нават нязначных памылак і пралікаў.

Апаненты абураюцца: вось гэта «як бы чаго не выйшла»! Ці не таму столькі вострых праблем паўстала, што аддаём перавагу бяздзейнасці?

Мы адышлі ад кансерватызму. Нам па душы перамены. Усё гэта так, але мудрымі мне зараз уяўляюцца галасы папярэджваючыя: тыя, хто захапіўся «зрываннем масак», не трацьце энергію толькі на разбурэнне. Выснова жыцця — стварэнне.

Вырашаць пытанні адным і эмоцыямі ці воляй асобных людзей бессэнсоўна. Толькі пазнаўшы карані праблемы, можна знайсці шляхі яе вырашэння.

А. САЛАЎЁЎ,
студэнт факультэта
журналістыкі.

## ЗВАРОТНАЯ СУВЯЗЬ

# Чаму вы не пішаце ў нашу газету?



ГАЛІНА ДАБРЫНСКАЯ, былы сакратар камітэта камсамола геаграфічнага факультэта:

Раней, калі была сакратаром камітэта камсамола, пісаць у газету часу літаральна не было. Іншы раз з'яўляліся розныя ідэі, хацелася падзяліцца сваімі думкамі. Але столькі падзей адбывалася ў адзін дзень, столькі клопатаў, што для журналістыкі не заставалася ні жадання, ні сілы. Ды й не вельмі проста непрафісіяналу вынесці свае думкі на старонкі газеты. Цяпер пісаць на камсамольскія тэмы не магу па прычынах асабістага характару.



Аляксандр КАВАЛЁЎ, студэнт V курса аддзялення палітэканоміі гістарычнага факультэта:

— Сапраўды, чаму б не напісаць? Уважліва чытаю вашу газету, часам знаходжу выдатныя матэрыялы. Напісаць можна, толькі... Зручней, калі кожны будзе займацца сваёй справай. І рэдакцыя таксама. Там жа людзі грошы за гэта атрымліваюць. Я — матэрыяліст, а, як вядома, ганарараў у вас не плоцяць.

Мае рэальныя прапановы?

Хоць у адным нумары у месяц даваць студэнтам магчымасць змяшчаць на старонках газеты публікацыі навуковых работ. На надзённыя тэмы.

Далей. Вы калі-небудзь публікавалі інтэрв'ю з сакратаром камсамольскай арганізацыі таго ці іншага факультэта? Я не чытаў ніколі. А хацеў бы...

Апошняе. У мінулым годзе праходзіў, калі памятаеце, гарадскі фінал КВЗ. Цікава? Думаеце, у студэнцтва такога вялікага горада, як Мінск, нямат падобных свят? Чаму б газеце не расказваць пра іх больш падрабязна.

## ТВАЯ СПРАВА Ў ЖЫЦЦІ



# ОРДЭНЫ НЕ КУПЛЯЮЦЬ

*Да загаду Міністра абароны заставалася два дні, да Толінага дня нараджэння — чатыры.*

*...Пасля чарговага выхаду дэсантная разведрота вярталася ў размяшчэнне часці. Машыны ішлі па серпанціну даволі хутка. Як заўсёды, Толя Смірноў і яго намкамроты Саша Сідарэнка знаходзіліся ў БМП, якая замыкала калону, у галаўной быў іх камандзір Герой Савецкага Саюза Ігар Пласканос.*

Узбіраючыся ўсё вышэй і вышэй угору, маторы раўлі больш напружана. Вось падышлі да таго месца, дзе аднойчы трапілі ў засаду. Нечакана адна з артылерыйскіх рэактыўных установак, што ішла ў сярэдзіне калоны, спынілася. Толя вылез з БМП. Што здарылася? Насустрач яму бег артылерыст:

— Вада ў радыятары закіпела...

— Гэтага яшчэ не хапала. Хутчэй залівайце,— Смірноў падагнаў хлопца.

Залівалі ваду хвілін дзесяць. Цішыня, стаяўшая навокал, наводзіла на трывожныя думкі. І тут, у пацвярджэнне нарастаўшай трывозе, узнялося полымя выбуху з-пад установкі, якая спынілася, услед часта застракаталі кулямёты. Праклятае месца! Адна з куль прабіла руку Сашу Сідарэнку, які знаходзіўся на брані. Дэсантнікі адкрылі агонь у адказ. Толя ў гэты час зацягнуў Сашу на БМП, той, знаходзячыся ў шоку, рваўся назад.

Далей усё адбывалася імгненна: «БМПэшка» рушыла ўздоўж калоны, вядучы агонь па варожых кропках, выробляючы такія піруэты, якім бы пазайздросціў любы гоншчык, нездарма ж Толя лепш за ўсіх у батальёне кіраваў баявой машынай пяхоты. Дзякуючы гэтаму ніводзін снарад не трапіў у самаходку.

Цяпер засталося спіхнуць падбітую ўстаноўку з дарогі. Але якраз у далечыні паказалася калона фургонаў «Саўтрансаўта». Аўтамашыны накіроўваліся ў самае пекла бою.

Толя крута развярнуў баявую машыну. Прыкрыць, інакш разаб'юць.

Калі БМП падкаціла да першага «МАЗа-супера», то скончыўся боезапас. Толя выскачыў з самаходкі, крыху не сутыкнуўшыся з прапаршчыкам, які суправаджаў калону. Той разгублена (адразу зразумела: яшчэ не нюхаў пораху) пракрычаў:

— Што рабіць?

— Страляць,— Толя агрызнуўся.— Навошта ў цябе аўтамат? — і пабег па снарады, на хаду адзначыўшы: прапаршчык, скеміўшы, відаць, што са зброі сапраўды страляюць, пасылаў, прымасціўшыся за каменем, доўгія чэргі.

Ворагі, убачыўшы дэсантніка, абрушылі на яго лівень свінцу. Кулі, бы рой куслівых пчол, віліся то ля галавы, то ўздымалі фантанчыкі пылу з-пад ног. Але Толя ўдачна дабраўся да самаходкі, дзе ляжалі снарады. Зваротны шлях таксама пад кулямі. Прынёс два снарады. Мала. Зноў вярнуўся да самаходкі. І тут адна з «пчол» балюча пеканула ў грудзі.

...Да Толінага дня нараджэння заставалася чатыры дні...

Месяц Смірнова лячылі ў шпіталі і не далячылі — збег. Збег у роту на баявую аперацыю. З Аляксандрам Сідарэнкам, у якога не зажыла рука, зноў ішлі замыкаючымі...

За мужнасць і гераізм пры аказананні дапамогі афганскаму народу Анатоль Смірноў быў узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі.

Нядаўна, сустрэўшыся з Толем, я спытаў у яго, ці не цягне назад у горы.

— Цягне, вярнуўся б у свой батальён, у сваю роту. Але я вельмі рады зараз таму, што нашы войскі, нарэшце, выводзяць з Афганістана.

## СТАРЭЙШЫ БРАТ

Пасля трэніроўкі хлопцы заходзілі ў раздзявалку расчырванелымі, стомленымі.

Руслан Толсцік, Слава Дзявочка, Дзіма Максімовіч, Вова Ковель, Сяргей Сямашка (яны навучэнцы СПТВ-71) і іншыя рабяты з СПТВ-24, 32 займаюцца ў клубе «Дэсантнік» пры спорткомплексе «Працоўныя рэзервы». Кіруе ім Анатоль Смірноў, зараз ужо студэнт юрыдычнага факультэта нашага універсітэта.

— Служыў у Афганістане, думаў, вярнуся і буду працаваць ці на машыне, якая возіць хлеб, ці на той, што возіць ваду,— расказвае Толя. — Так, пра зброю, пра ўсё, што звязвае з вайной, нават думаць не хацелася, хацелася цішыні. Але потым, калі пачаў працаваць з хлапчукамі, зразумеў: гэта маё. Іменна ваенна-патрыятычная работа.

І прызнаюся: часта бываючы на трэніроўках у Толі, я зайздросціў тым хлопцам, якіх ён трэніруе, таму што жадання захапіць хлопчыкаў, дапамагчы ім знайсці сябе — у Толі не адняць. Ён імкнецца пастаянна рабіць трэніроўкі разнастайнымі, каб на іх было цікава. Паказальна і тое, што ў клуб прымаліся ўсе жадаючыя, абмежаванняў не было — гэта Толін прынцып. Калі ласка, можаш сябе праверыць! А нагрузкі зусім не норма ГПА. Але клуб мала хто пакідаў. У чым сакрэт?

— Ён для нас выкладваецца цалкам і не толькі на трэніроўках,— выказвае агульную думку сваіх сяброў Слава Дзявочка.— Колькі давялося шукаць памяшканне для гульні ў баскетбол, валейбол, процівагазы, іншы інвентар для заняткаў, а ён знайшоў. І наогул, словы са справай у яго не разыходзяцца, таму для нас Толя як старэйшы сябра, калі хочаце, як брат..

Дарэчы, патрэбна сказаць, рабяты востра адчуваюць, як да іх адносяцца. У Толі яны знаходзяць той жыццёвы максімалізм, які блізкі іх юнацкаму. Максімалізм, які дазваляе паступаць сумленна, не пасаваць перад цяжкасцямі, выхоўвае сілу волі. Напрыклад, Слава Дзявочка толькі на дарогу на трэніроўкі траціць у дзень дзве гадзіны, але хіба гэта можа стаць перашкодай для заняткаў любімай справай. Рабяты ўпэўнены: не. А на бадзянне па пад'ездах яны не распыляюцца.

Трэніроўкі ў клубе выпрацоўваюць спрыт, вынослівасць, сілу, карацей, удасканальваюць фізічныя магчымасці хлопцаў. Вова Ковель да таго, як прыйшоў у «Дэсантнік», на перакладзіне падцягваўся восем разоў, зараз — цэлых дваццаць. А лепш праверыў дасягненні хлопцаў паход, арганізаваны ў адну з нядзель.

Прайшлі больш за трыццаць кіламетраў, правялі чарговую трэніроўку, а на зваротным шляху зрабілі маршкідок па ўсіх воінскіх правілах і ў процівагазах. «Слабакоў» не аказалася.

Зараз «дэсантнікі» рыхтуюцца да больш працяглага паходу, да гарадскіх спаборніцтваў сярод ваенна-патрыятычных клубаў. Але гэта з'яўляецца толькі невялікай часцінкай задуманага. У Толі з рабятамі мноства ідэй, я б сказаў, планаў больш грандыёзных.

Хочацца мець сваю спартыўную залу з трэнажорамі, з душавой, ваеннае абмундзіраванне (некаторым клубам пашчасціла) для палявых выхадаў, мець магчымасць вывучаць тэхніку.

Мне думаецца, іх задумкі ажыццявяцца, тым больш, што памяшканне для спартыўнай залы ўжо, здаецца, знайшлі, засталося падпісаць некалькі афіцыйных папер. Ажыццявяцца яшчэ і таму, што рабят клуба звязвае не толькі «накачванне» мышцаў, але і цеснае мужчынскае сяброўства.

...Пасля трэніроўкі Толя з хлапчукамі шумнай ватагай ідуць піць сок. У адрозненне ад многіх сваіх аднагодкаў, «дэсантнікі» не лічаць зацяжку цыгарэтай прыкметай сталення, таму што разумеюць: арміі патрэбны здаровыя людзі.



Д. МАЛІНОЎСКІ,
студэнт
факультэта
журналістыкі.

АДБЫЛОСЯ Ў ЛІСТАПАДЗЕ

## НАЗІРАННІ

На дзіва, месцы ў зале пуставалі. Няўжо нікога не прывабіў агеньчык манатарыума — свята першакурснікаў? Не, на шчасце, гэтага не здарылася. Проста, «цягучасць» студэнтаў у часе праявілася і тут. І пачалося...

Вусны першаадкрывальнікаў (студэнтаў ІІ курса журфака) не прамовілі ні слова, але за іх гаварылі групы «Кіно», «Акварыум», пад песні якіх і была паказана кампазіцыя. Кампазіцыя эвалюцыі жыцця, кампазіцыя абуджэння розуму чалавечага.

Было што паказаць і гаспадарам вечара — першаму курсу. Каму не па душы былі чароўная ўсмешка, даверлівы голас вядучай — Тані Юрко, юнацкая неўтаймаванасць Лёшы Цітова, таленавітая віртуознасць Ігара Паляшчука, яго ўменне ўваходзіць у вобраз і японскай спявачкі, і Генадзя Хазанава... Шмат чаго натуральнага было ў сцэнцы прыёму экзамена. Пад агульныя алпадысменты дзейнічаў прывід, развешваючы на вушах выкладчыка лапшу.

На сцэне — пяты курс. Першакурснікам, дый астатнім, перадалі ў спадчыну ў гумарыстычным афармленні трапныя характарыстыкі амаль кожнага выкладчыка, нават занадта вострыя жарты, якія бытуюць у асяроддзі студэнтаў. А як жа ў літаральным сэнсе першы курс быў уведзены ў гэта асяроддзе? Ім, а дакладней, па іх, пасвяцілі толькі ліхтарыкам. Вось так выпускнікі універсітэта, за якімі, здавалася б, самае важкае слова, ухіліліся ад яго.

Але гэта ўражанне было згладжана выступленнем групы «Секунда Сі» пад кіраўніцтвам Сяргея Бабака. Гэта быў дэбют групы, які адбыўся ў родных сценах. І самы вялікі падарунак першакурснікам-студэнтам. І як замацаванне гэтага звання, як знак таго, што яны ўжо сталі зусім нашымі,— першая агульная дыскатэка. Вясёлая, гарачая, імклівая. Навокал чыстыя, добразычлівыя ўсмешкі на тварах юнацтва.

## МЕРКАВАННІ

СУМНА-ІРАНІЧНАЕ. Ад студэнткі 3-га курса я пачула:

— У нас пасвячэнне прайшло вельмі добра, у вас — добра без «вельмі», а гэтае нават на «добра» не цягне. Праўда?

Так.

АПТЫМІСТЫЧНАЕ. Але віншаванне першакурснікаў тым не менш удалося. Не адчувалася надакучыўшай усім імправізацыі на сцэне. Прысутнічала творчасць у кожным выступленні. Ды і ў тэматыцы перасталі «таптацца» на месцы: праблемы інтэрната, новага будынка журфака.

НАСЦЯРОЖВАЮЧАЕ. Замест выхаду на сцэну чацвёртага курса над залай навісла мінута іранічнага маўчання. А яму ж у будучым годзе быць разам з будучым першым у галоўных дзеючых асобах...




## ПРАПАНОВА

Пасвячэнні першакурснікаў у студэнты адбываюцца ў апошнія восеньскія дні на кожным факультэце. Традыцыйна лічацца яны святам. Бесклапотным і вясёлым. Толькі мы лічым, што на самой справе нядрэнна было б стаць ім даследаваннем: хто прыйшоў на факультэт, якія таленты хаваюць у сабе сарамлівыя першакурснікі. Або працай: па тлумачэнню тонкасцей студэнцкага жыцця, па падрыхтоўцы навічкоў да першай сесіі.

А як на тваю думку, чытач?

А ШТО, КАЛІ...

# НАСТРОЙ ЗА ДВА РУБЛІ?

***Цягнік спыніў сваю ходу на канцавой станцыі. З дзвярэй вагонаў хлынуў людскі паток. Хтосьці спяшаўся на аўтобусны, трамвайны прыпынак, хтосьці — на метро. Частка пасажыраў пачала прыстройвацца да чаргі каля «пазіка», што стаяў каля чыгуначнага вакзала. Што гэта за дзіва-аўтобус!***

Тут пры дапамозе ЭВМ выдаюць графікі біярытмаў чалавека на цэлы год. Дзякуючы такому замярэнню, можна даведацца аб біярытмах фізічнага, эмацыянальнага і інтэлектуальнага стану. Рэкламныя афішы на аўтобусе запрашалі замераць іх і ў дадатак напаміналі, што біярытмы — гэта нашы ўчынкі, наш настрой, нашы думкі. Увага да іх — гэта поспех у рабоце, адпачынку, асабістым жыцці. Калі параўнаць свае біярытмы з біярытмамі нашых блізкіх, можна пазбегнуць сямейных канфліктаў. Не шкадуй толькі двух рублёў і лічы, што добры настрой ў цябе ў кішэні.

Гаспадарамі аўтобуса аказаліся інжынер-электрык Алег Леанідавіч Вечар і інжынер-праграміст Аляксандр Георгіевіч Юркоў з навукова-вытворчага аб'яднання «Цэнтр». Дарэчы, іменна яны і былі ініцыятарамі стварэння гэтага выязнога аўтобуса, насычанага электравылічальнай тэхнікай. Пакуль ЭВМ вычэрчвае на аркушы паперы графік маіх біярытмаў, гутару з А. Л. Вечарам:

— За суткі (а мы тут працуем з пятнаццаці да дванаццаці двух гадзін вечара) даводзіцца абслугоўваць больш за 100—150 чалавек. А ў выхадныя дні ўдвая больш. Людзі да гэтай справы адносяцца па-рознаму. Адны адабраюць, прыкладна 25 працэнтаў наведвальнікаў задаюць пытанні, стараюцца як мага больш даведацца аб біярытмах. Ёсць сярод іх і такія, што прыйдуць да нас, паглядзяць, распытаюць, з'ездзяць дахаты і прыязджаюць зноў, каб зрабіць такія схемы для ўсіх членаў сям'і. Многія лічаць, што гэта прыемны і нечаканы падарунак да Дня нараджэння.

— Графік біярытмаў калі-небудзь апраўдаў сябе ў жыцці?

— Такіх прыкладаў можна прывесці шмат. Лічачы па той інфармацыі, што паступае да нас з-за мяжы, там гэта справа прыжылася і шырока выкарыстоўваецца. З яе дапамогай адміністрацыя сочыць за станам рабочых (у першую чаргу маю на ўвазе тых, чыя праца звязана з перавозкай людзей на чыгуначным, аўтамабільным і авіяцыйным транспарце). Калі ў вадзіцеля выпадаюць крызісныя дні, яму не дазваляюць выязджаць у рэйс, стараюцца знайсці замену. Вынік бачны адразу — рэзка паменшылася колькасць аварый. Але гэта не значыць, што ў такія дні не трэба нічога рабіць, а ляжаць у ложку і глядзець у столь. Знайдзіце сабе менш адказную работу.

Гэта справа таксама апраўдала сябе ў адным з маскоўскіх таксапаркаў. Калі чалавек будзе ведаць, у якія дні яму патрэбна быць больш уважлівым і пільным, ён расплануе сваю работу адпаведна той інфармацыі, якую мы выдаём. Мы ўпэўнены, што ад гэтага нікому горш не будзе. Да таго ж, кожны з нас імкнецца даведацца пра сябе значна больш, чым пакуль ведае.

— І каму ў першую чаргу вы параілі б прыйсці да вас і зрабіць схему біярытмаў?

— Больш цікавяцца гэтым маладыя людзі ва ўзросце 20 гадоў (гэта значыць, маладыя вучоныя, маладыя спецыялісты, студэнты). Бываюць і наведвальнікі пенсіённага ўзросту. Я ж лічу, што ў першую чаргу карысна было б зрабіць графік біярытмаў спартсменам, шафёрам, студэнтам, усім тым, хто займаецца інтэлектуальнай працай. Гэта прынясе станоўчы эфект: стане больш прадукцыйнай праца, узрасце паспяховасць сярод студэнтаў, менш будзе разводаў...

ЭВМ начарціла апошні радок у графіку. На дысплеі з'явіўся надпіс: «Работа закончана». Алег Леанідавіч дастаў з машыны гатовы графік маіх біярытмаў на цэлы год. Адразу цікаўлюся тым месяцам, у якім пачынаецца зімовая сесія. Які ў мяне будзе настрой? І з палёгкай уздыхаю: у радку маіх інтэлектуальных біярытмаў стаяць адны плюсы (спрыяльныя для вучобы, здачы экзаменаў дні). Значыць, настрой будзе добры. А вы хочаце даведацца аб сваім настроі ў час зімовай сесіі? Калі так, то спяшайцеся на чыгуначны вакзал і не забудзьцеся захапіць з сабой два рублі за добры настрой.

А. МІХАЛЕВІЧ,
студэнт факультэта журналістыкі.

АФІЦЫЙНЫ АДДЗЕЛ

УСЕАГУЛЬНЫЯ перапісы насельніцтва служаць асноўнай і найбольш поўнай крыніцай звестак аб колькасці і складзе насельніцтва, яго сацыяльнай і нацыянальнай прыналежнасці, характары заняткаў, міграцыйных перамяшчэнняў, крыніцах сродкаў існавання. Вынікі перапісу адлюстроўваюць тыя змены, якія адбыліся ў сацыяльна-дэмаграфічным развіцці краіны і кожнага народа.

Пастановай Савета Міністраў СССР падрыхтоўка і правядзенне перапісу ўскладзена на Дзяржаўны камітэт СССР па статыстыцы.

У сучасных умовах, калі ў аснову эканамічнага развіцця дзяржавы пастаўлены сацыяльныя пытанні, асабліва важныя падрабязныя і ўсебаковыя звесткі аб насельніцтве як галоўнай вытворчай сіле і галоўным спажыўцы ўсіх даброт і паслуг. Значэнне перапісу ўзрастае яшчэ і таму, што ў краіне пачалася вялікая работа па перабудове ўсіх бакоў эканамічнага і грамадскага жыцця, шырокая дэмакратызацыя грамадства, актывізацыя чалавечага фактара. Кожны з нас павінен быць актыўным удзельнікам гэтага працэсу. Але для гэтага неабходна ўяўляць заканамернасці будаўніцтва сацыялістычнага грамадства, у тым ліку і развіцця насельніцтва.

# Усё пра ўсіх за чатыры дні

Наша дзяржава мае дзве асаблівасці: яна самая вялікая ў свеце па тэрыторыі і вельмі складаная па этнічнай структуры насельніцтва. Гэта таксама абумоўлівае неабходнасць правядзення ўсеагульных перапісаў, таму што даныя бягучага ўліку адказваюць толькі на пытанне аб змяненні колькасці насельніцтва таго ці іншага рэгіёна, населенага пункта, рэспублікі ў выніку нараджальнасці, смяротнасці, прыбыцця і выбыцця мігрантаў.

Усе астатнія звесткі аб насельніцтве (самыя падрабязныя) дае толькі перапіс. У выніку яго вызначаецца састаў насельніцтва па полу і ўзросту, колькасць сем'яў, іх велічыня і дзетнасць. Гэтыя даныя дазволяць планаваць развіццё і размяшчэнне сеткі дзіцячых дашкольных устаноў, школ, вызначыць патрэбу ў таварах спажывання і паслугах, затраты на сацыяльнае забеспячэнне, разлічыць балансы працоўных рэсурсаў, вызначыць велічыню і якасць працоўнага патэнцыялу краіны.

Звесткі аб знаходжанні ў шлюбе дазволяць меркаваць аб тым, як змяняюцца пакаленні нашай краіны, ці вялікая колькасць халастых і незамужніх людзей, ці стабільныя нашы сем'і, ці вялікая доля ўдоў і разведзеных, адзінокіх маці, якія выхоўваюць дзяцей без бацькі; ці многа маладых сем'яў. Прычым, усе гэтыя даныя можна супаставіць у дынаміцы, у параўнанні з папярэднімі перапісамі, можна параўнаць стан па рэспубліках і нават асобных гарадах і раёнах. Гэта значыць, дыферэнцыравана праводзіць дэмаграфічную палітыку.

Перапіс дапаможа ўстанавіць і характар размяшчэння насельніцтва па тэрыторыі краіны, яго міграцыйную рухавасць, геаграфію перасяленняў, стабільнасць пражывання. Гэтыя даныя можна спалучыць з іншымі характарыстыкамі (пол, узрост, нацыянальнасць, занятак, прафесія, узровень адукацыі, сацыяльная прыналежнасць) і зрабіць вывады аб структуры, прычынах і следствах міграцыі для розных раёнаў краіны.

Для нашай шматнацыянальнай краіны надзвычай важнае пытанне аб нацыянальнасці і роднай мове. Яно пастаянна ўключаецца ў праграму перапісу і заснавана на прынцыпе самавызначэння, гэта значыць, чалавек сам вызначае, да якой этнічнай супольнасці ён належыць і якую мову лічыць роднай. Гэтыя даныя дазваляюць правільна ўлічваць нацыянальныя асаблівасці кожнага рэгіёна ў планаванні эканамічнага, сацыяльнага і культурнага развіцця.

Іх выкарыстоўваюць пры вызначэнні патрэбы ў нацыянальных кадрах настаўнікаў, у школах, сродках масавай інфармацыі, выпуску літаратуры і г. д.,

Рэзультаты перапісу дазволяць ацаніць адукацыйны патэнцыял нашага грамадства, прафесійную падрыхтоўку кадраў, дазволяць выявіць адстаючыя групы насельніцтва або раёны, дадуць уяўленне аб колькасці навучэнцаў, спецыялістаў, якія прыйдуць у народную гаспадарку.

Па даных перапісу вызначаецца ступень працоўнага ўдзелу насельніцтва і характар занятасці, адкуль чалавек атрымлівае сродкі для жыцця; наколькі вялікая роля ўласнай падсобнай гаспадаркі, індывідуальнай працоўнай дзейнасці; ці многа ўтрыманцаў, пенсіянераў, стыпендыятаў; на якія сродкі жывуць сем'і рознага тыпу, розныя сацыяльныя і нацыянальныя групы насельніцтва.

Упершыню ў праграму перапісу ўключаны пытанні аб жыллёвых умовах насельніцтва. Гэтыя даныя патрэбны дзяржаве для планавання жыллёвага будаўніцтва з улікам тэрытарыяльных асаблівасцей. Перапіс пакажа, якія групы насельніцтва маюць асаблівую патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў, колькі сем'яў жыве ў агульных або нядобраўпарадкаваных кватэрах, а таксама на кватэрах, хто яны па саставу, сацыяльнай і нацыянальнай прыналежнасці.

Такім чынам, праграма Усесаюзнага перапісу насельніцтва 1989 года вельмі шырокая. Яна ўключае трынаццаць пытанняў суцэльнага перапісу (г. зн. для кожнага жыхара краіны); 5 пытанняў будуць зададзены не ўсім, а выбарачна — у кожным чацвёртым жылым памяшканні. Гэтыя 18 пытанняў будуць характарызаваць кожнага асобнага чалавека ці сям'ю. Наступныя сем пытанняў прызначаны для атрымання звестак аб жыллёвых умовах насельніцтва.

Патрэбна сказаць, што звесткі перапісу будуць выкарыстаны толькі для атрымання зводных даных і ні ў якім разе не закрануць уласных інтарэсаў грамадзян. Яны будуць выкарыстаны для планавання і праектавання, для практычнай арганізацыі адміністрацыйнай і гаспадарчай работы, для патрэб дзяржаўнага кіравання і навуковага пазнання працэсаў развіцця народанасельніцтва краіны.

Дакладнасць перапісу будзе залежаць ад правільнасці і дакладнасці нашых адказаў. А поспех яе — у садзеянні і дапамозе ў правядзенні з боку кожнага жыхара краіны.

Б. МАНАК,
дацэнт геаграфічнага факультэта,
член камісіі па правядзенню
Усесаюзнага перапісу насельніцтва 1989 года.

БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

Цана 2 кап.
Мінская паліграфічная фабрыка «Чырвоная зорка» МВПА імя Я. Коласа.
17 лістапада
Зак. 1636.

220080, Мінск-80, УНІВЕРСІТЭЦКІ ГАРАДОК, ВУЛ. БАБРУЙСКАЯ, 9, ПАВЕРХ 4, ПАКОІ 74-75.
ТЭЛЕФОН 20-68-27.

В. а. рэдактара
М. Г. ЗАГОРСКАЯ.